УДК 63 (091) (476)

*Л.І. Ермаковіч*

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРАДВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1939–1941 гг.)

У артыкуле аўтар паспрабаваў вылучыць і прааналізаваць асноўныя накірункі аграрнай палітыкі савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў перадваенны перыяд: вынішчэнне аграрнай спадчыны польскай дзяржавы і заможнай часткі сялянства, мерапрыемствы па задавальненню эканамічных інтарэсаў вясковай беднаты, пачатак калгаснага будаўніцтва. У кантэксце тэмы таксама разглядаецца змест масава-палітычнай работы сярод сялянства з мэтай змянення яго псіхалогіі і стварэння прывабнага іміджу савецкай улады. На думку аўтара, аграрная палітыка савецкай улады першапачаткова з’яўлялася безальтэрнатыўнай, пазбаўляла селяніна эканамічнай свабоды, абмяжоўвала яго гаспадарчую самастойнасць. Яна мела стратэгічнай мэтай стварэнне адпаведных умоў для развіцця сельскай гаспадаркі па калгаснаму шляху, які абвяшчаўся адзіна правільным шляхам працоўнага сялянства да сацыялізму.

## Уводзіны

Састаўной часткай народнагаспадарчага комплекса нашай краіны з’яўляецца аграрны сектар. Яго развіццю ў савецкія часы надзялялася вялікая ўвага. Такая ж увага яго развіццю і ўдасканаленню надаецца дзяржаўным кіраўніцтвам і на сучасным этапе. Гэта тлумачыцца тым, што прыродна-кліматычныя ўмовы ў спалучэнні з традыцыйнай для беларусаў працавітасцю і цягай да працы на зямлі, выкарыстаннем сучасных навукаваёмістых тэхналогій дазваляюць за кароткі час рэзка павялічыць аб’ёмы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і на гэтай аснове па ўсіх паказчыках поўнасцю задаволіць не толькі ўнутраны попыт на яе, але і яшчэ істотна нарасціць экспартны патэнцыял сельскай гаспадаркі. Таму паспяховае развіццё аграрнага сектара з’яўляецца важнай умовай росту грамадскага багацця і матэрыяльнага дабрабыту народа. Пры ажыццяўленні аграрнай палітыкі заўсёды важна ўлічваць гістарычны вопыт сельскагаспадарчага развіцця, як пазітыўны, так і негатыўны. Асабліва, калі гэты вопыт датычыцца ўзаемаадносін дзяржавы з галоўнай фігурай у сельскай гаспадарцы – селянінам, адносіны якога да працы прадвызначаюць канчатковы вынік гаспадарання на зямлі.

У дадзеным артыкуле разглядаюцца і аналізуюцца першасныя мерапрыемствы савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі пасля яе ўз’яднання з БССР восенню 1939 года ўключна да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Якраз гэтаму перыяду ў развіцці аграрных адносін у айчыннай гістарычнай навуцы нададзена найменш увагі. Гэтая акалічнасць таксама спрычынілася да выбару тэмы артыкула.

## Мерапрыемствы савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1939 – 1941 гг.

Да 25 верасня 1939 г. Чырвоная Армія цалкам заняла тэрыторыю Заходняй Беларусі. Услед за ёю сюды для ўсталявання савецкай улады былі накіраваны на партыйную работу 1 500, на камсамольскую, савецкую і гаспадарчую – 1 200 камуністаў і камсамольцаў, сотні супрацоўнікаў Народнага камісарыята ўнутраных спраў. Асноўная частка насельніцтва (85%) Заходняй Беларусі пражывала ў вёсцы і займалася сельскагаспадарчай працай. У вёсках і мястэчках органамі новай улады з’яўляліся сялянскія камітэты. У іх склад выбіраліся прадстаўнікі беднякоў, серадднякоў і парабкаў. Не чакаючы заканадаўчых актаў гэтыя камітэты дзялілі памешчыцкую і царкоўную зямлю сярод беззямельных і малазямельных сялян, якія за кароткі час ат-рымалі 431 тыс. га

зямлі і сенажацей. Ім таксама было перададзена 14 тыс. коней і 33,4 тыс. кароў, выдавалася зерне на пасеў [1, с. 255–256]. У выніку ужо восенню 1939 г. было істотна падарвана польскае памешчыцкае землеўладанне.

Важнае значэнне для працэса аграрных пераўтварэнняў мела прынятая Народным сходам Заходняй Беларусі Дэкларацыя аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель. У ёй абвяшчалася канфіскацыя без ўсякага выкупу зямель памешчыкаў, манастыроў, буйных дзяржаўных чыноўнікаў з усім інвентаром, жывёлай і сядзібнымі пабудовамі. Уся зямля з яе нетрамі, лясамі і рэкамі абвяшчалася ўсенародным здабыткам, або дзяржаўнай уласнасцю.

Ліквідавалася таксама асадніцкае землеўладанне. Рашэнне аб гэтым звычайна прымалася сялянскімі камітэтамі і пастановамі агульных сходаў сялян па месцы іх жыхарства. Як гэта адбывалася, нагляднае ўяўленне дае пастанова агульнага сходу сялян вёскі Явар Слонімскага ўезда Баранавіцкай вобласці. На сходзе 11 лістапада 1939 г. сяляне пастанавілі: выдаліць польскіх асаднікаў з дзялянак, атрыманых ва ўзнагароду за заслугі ў барацьбе супраць Чырвонай Арміі ў 1918–1920 гг. Зямельныя надзелы разам з пабудовамі, а таксама буйную рагатую жывёлу, коней з вупражжу, сельскагаспадарчы інвентар, хлеб і корм канфіскаваць [2, с. 260]. Колькасць асаднікаў была даволі значнай. Толькі ў Пінскай вобласці са снежня 1939 г. па лістапад 1940 г. было выселена 1 135 асадніцкіх гаспадарак з колькасцю 6 127 чалавек [3, с. 19]. З Брэсцкай вобласці толькі ў лютым 1940 г. было выселена 1 585 асаднікаў і работнікаў лясной аховы. Усім выселеным з вобласці асаднікам належала наступная ўласнасць: коні – 1 267 галоў, буйная рагатая жывёла – 3 772 галавы, авечкі – 1 893 галавы, свінні – 2 814 галоў, хатняя птушка – 13 504, вуллі з пчоламі – 1 198, збожжа – 7 318 цэнтнераў, бульба – 33 457 цэнтнераў, жылых дамоў – 1 034, гаспадарчых пабудоў – болей 3 тысяч [4, с. 202]. Пасля высялення маёмасць асаднікаў бязвыплатна перадавалася калгасам і сялянам, часткова раскрадалася.

Падчас падзелу памешчыцкіх і асадніцкіх маёнткаў зімой–вясной 1940 г. сяляне атрымалі 1 млн. га ворыўнай зямлі, 33,4 тыс. кароў, 15,7 тыс. свіней, 14 тыс. коней [5, с. 38]. Гэта садзейнічала стварэнню значнай сацыяльнай апоры савецкай улады з ліку батрацка-бядняцкай часткі сялянства, а таксама прывяло да павелічэння праслойкі сялян-сераднякоў. Разам з тым неабходна адзначыць, што заходнебеларуская вёска паранейшаму заставалася малазямельнай. Больш за 40% сялянскіх двароў мелі да 5 га зямлі, што не стварала ўмоў для росту прадукцыйнасці сельгасвытворчасці і забеспячэння годнага ўзроўню дабрабыту сялян. Да таго ж культура гаспадарання была ў большасці выпадкаў прымітыўнай. На тое існавалі розныя прычыны: адсутнасць сучасных агратэхнічных ведаў, інвентару, востры недахоп цяглавай сілы, гатунковага насення, пародзістай жывёлы, фінансавых сродкаў.

Разам з тым надзяленне сялян зямлёй сведчыла пра задавальненне іх галоўнага эканамічнага інтарэсу. Тым самым была створана галоўная умова для паступальнага (эвалюцыйнага) уздыму сельскагаспадарчай вытворчасці, росту яе прадукцыйнасці і адпаведна – росту дабрабыту самога сялянства і ўсяго грамадства. Натуральна, што патрэбны былі многія іншыя крокі новай улады па ўмацаванню гаспадарчай самастойнасці, асабістай матэрыяльнай зацікаўленасці селяніна-гаспадара ў плённай працы на зямлі. У прыватнасці, гэтыя крокі вымагалі прававога забеспячэння гаспадарчай самастойнасці селяніна,увядзення ашчаднай падатковай сістэмы, развіцця розных форм кааперацыі ў вёсцы, стварэння спрыяльнай крэдытнай сістэмы і многага іншага.

Зразумела, што такі шлях развіцця сельскай гаспадаркі азначаў захаванне і развіццё індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, якая грунтавалася на гаспадарчай самастойнасці селяніна, яго эканамічнай свабодзе, развіцці рыначных адносін. Аднак гэта супярэчыла ідэалогіі кіруючай бальшавіцкай партыі з яе прынцыпамі татальнага абагульнення ўласнасці і безумоўнага падпарадкавання асобы і грамадства дзяржаве. Гэтыя прынцыпы былі поўнасцю ўвасоблены ў СССР і БССР падчас будаўніцтва сацыялізму ў 1920–1930-я гг., састаўной часткай якога стала калектывізацыя сельскай гаспадаркі, у выніку чаго быў ліквідаваны клас сялянства. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва не жадала ў гэтай сувязі рабіць нейкага выключэння для народа Заходняй Беларусі, ствараць нейкі новы вопытны ўзор сацыяльна-эканамічнага развіцця, які б складаў альтэрнатыву ўжо апрабіраванаму і рэалізаванаму на практыцы сацыяльстычнаму ўзору развіцця грамадства.

З пачатку 1940 года бальшавікі актыўна распачынаюць вытворчае кааперыраванне ў заходнебеларускай вёсцы, гэта значыць, стварэнне калектыўных гаспадарак на аснове абагульнення галоўных сродкаў вытворчасці селяніна – зямлі, рабочай жывёлы, прылад працы. Пры гэтым яны абапіраліся на бяднейшую частку вёскі, якая падтрымлівала ліквідацыю памешчыцкага і асадніцкага землеўладання,дэпартацыю часткі польскага насельніцтва і складала аснову сялянскіх камітэтаў, а затым – мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных. Менавіта батрацка-бядняцкія слаі сялянства былі галоўнай сацыяльнай апорай бальшавікоў у калгасным будаўніцтве, бо ім не было чаго губляць, акрамя свайго беспрасветнага жабрацтва і часта непаважлівых адносін больш заможных суседзяў, якія лічылі галоўнай прычынай іх беднасці безгаспадарлівасць і гультайства. Што да серадняков і заможнай часткі сялян, то яны да палітыкі калектывізацыі ставіліся непрыхільна.

З самага пачатку калектывізацыі мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі была шырока разгорнута агітацыйная і прапагандысцкая праца. Увесь час падкрэслівалася, што калгасы – гэта адзіны сродак дасягнуць заможнага жыцця, і тыя, хто супраць калгасаў,з'яўляюцца ворагамі савецкай улады і самога сялянства. Увогуле агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць мела яскравую ідэалагічную афарбоўку. Скарыстоўваўся адпаведны набор ідэалагічных штампаў тыпу: «усё вакол калгаснае – усё вакол маё», «калгасны двор – заможны двор», «кулак – вораг селяніну», «савецкая ўлада як л**ю**бая маці» і іншыя. Цікава звярнуць увагу на адну важную акалічнасць: любыя крокі ўлады ў вёсцы выдаваліся за клопат савецкай дзяржавы аб селяніне-працаўніку, нават калі яны датычылася абкладання сялянскіх гаспадарак сельгаспадаткам, увядзення абавязковых натуральных паставак сельгаспрадукцыі дзяржаве, падпіскі сялян на дзяржаўную пазыку ў фонд трэцяй пяцігодкі (на 1940 і 1941 гг.). Тыя сяляне, якія свядома ці бяздумна адабралі мерапрыемствы ўлады, уключаліся ў стан «свядомых» і «перадавых». У сваёй абсалютнай большасці гэта былі людзі непісьменныя, гаспадарча не ўгрунтаваныя, не аўтарытэтныя ў сялянскім асяроддзі. Яны першымі станавіліся ахвярамі і адначасова носьбітамі бальшавіцкай прапаганды. Гэтая прапаганда ўздымала іх на палітычны шчыт, усяляк усхваляла, штучна рабіла лідэрамі грамадскай думкі, выдавала іх думкі за погляды ўсяго працоўнага сялянства. Адначасова ўсіх тых, хто меў альтэрнатыўную думку, крытычна ставіўся да ажыццяўляемых мерапрыемстваў у вёсцы ў лепшым выпадку прылічвалі да «несвядомых», а ў горшым – навешвалі ярлыкі падкулачнікаў, класава чужых элементаў, ворагаў працоўнага сялянства. Пры гэтым прыхарошвалася жыццё калгаснікаў ва ўсходняй частцы Беларусі.

Частка сялян успрымала бальшавіцкую прапаганду і падштурхоўваемая цяжкімі жыццёвымі абставінамі сама звярталася да партыйных і савецкіх уладаў з просьбай

аказаць дапамогу ў арганізацыі калгасаў. Вось што пісалі сяляне вёскі Казённыя Лычыцы Любчанскага раёна Баранавіцкай вобласці 27 сакавіка 1940 г. у сваім звароце ў выканкам раённага савета: «Ведаючы, як хораша і культурна жывуць калгаснікі ў Савецкім Саюзе і параўноўваючы наша жыццё з іх жыццём, мы … пастанаўляем: прасіць савецкую ўладу дапамагчы нам арганізаваць у сваей вёсцы калгас. Абрыдла нам, беззямельным і малазямельным, доўгія гады працаваць паўгалоднымі і раздзетымі на сваіх вузенькіх палосках… Часта з усходу разам з цёплым вясеннім ветрам да нас даляталі дзівосныя матывы вольных, радасных песень, якія калгаснікі спяваюць падчас працы на сваіх шырокіх палях. А мы ў гэты час старым плугам аралі свае палоскі і плакалі. Не хоча цягнуць плуг галодны конь. Няма чым абсемяніць зямельку. Галадна і холадна ў хаце, плач дзяцей і горкія слёзы жанок раздзіралі душу. Не, хопіць ужо. Мы не жадаем далей так жыць» [2, с. 260]. Аднак многія сяляне недаверліва ставіліся да прапаганды, бо баяліся адважыцца на глыбокія зрухі ў сваім жыцці з непрадказальнымі наступствамі. Акрамя таго, пэўная частка сялян была знаёма з негатыўнымі наступствамі калектывізацыі ва ўсходніх абласцях Беларусі ў 1920–1930-я гг. Усё гэта разам істотна зніжала эфектыўнасць працы па прапагандзе калектыўных формаў гаспадарання ў вёсцы. Паколькі агітацыйна-прапагандысцкая праца не прыносіла патрэбных вынікаў (большасць сялян не ішла ў калгасы), то пры правядзенні калектывізацыі, як і ў свой час ва Усходняй Беларусі, шырока парушаўся прынцып дабраахвотнасці ўступлення ў калгасы. Шырока практыкаваліся прымусовае абагульненне жывёлы, насення і інвентару, пагрозы і запалохванне, навешванне палітычных ярлыкоў, пазбаўленне выбарчых правоў, ігнараванне палажэнняў існуючых законаў і Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі.

Важным сродкам прымусовай калектывізацыі з’яўлялася падатковая палітыка дзяржавы. Усе аднаасобныя гаспадаркі павінны былі выплачваць адзіны сельгаспадатак і выконваць натуральныя дзяржаўныя пастаўкі сельгаспрадукцыі. Велічыня падатку залежала ад нормы прыбытковасці зямлі, якая адвольна вызначалася і пастаянна карэкціравалася ў бок павелічэння. На памер падатка таксама ўплывала колькасці зямлі і жывёлы ў сялянскай гаспадарцы. Дзяржпастаўкі налічваліся зыходзячы з фактычнай колькасці зямлі, якая мелася ў селяніна-аднаасобніка ў карыстанні, а менавіта: ворыва, сенажаці, пашы, хмызнякоў, пустэчы. Абавязковыя дзяржаўныя пастаўкі пазбаўлялі сялян значнай часткі вырабленай імі прадукцыі, якая прадавалася па мізэрных цэнах. Яны былі значна больш нізкімі, чым рыначныя і нават не пакрывалі сабекошту пастаўляемых дзяржаве мяса, малака, воўны, яек і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі.

Такая палітыка падштурхоўвала сялян да ўтойвання часткі сваіх пасяўных плошчаў, скарачэння хатняй жывёлы, яе забою, перадзелу і пераразмеркаванню гаспадарак паміж блізкімі сваякамі і суседзямі каб зменшыць падатковы ціск. З-за вялікага падатковага прэсу сяляне часта звярталіся ва ўладныя органы з просьбай зменшыць памеры дзяржпаставак. Вось толькі адзін прыклад: сялянка Хідрынскага сельсавета Кобрынскага раёна Лазарчук Г.А. у снежні 1940 г. звярнулася з просьбай аб вызваленні яе ад дзяржпаставак бульбы ў сувязі з неўраджаем. Змест заявы наступны: «Бульба не ўрадзіла, калі ўсю здам, то не застанецца насення для вясновай сяўбы. Запазычанасць складае 257 кг. Мяса здала 80 кг. Жыта здала ўсё. Грашовага падатку засталося за мной 80 рублёў… Жыву вельмі бедна… Коней не маю – пара невялічкіх бугаёў. Кароў 2 шт. Адну зараз прадам на выплату падатка. Свіней, авечак і іншай жывёлы не маю. Сям’я ў складзе 4-х чалавек. Да працы здольная я адна, але слабая, маю болей 40 гадоў. Бацьку мужа 85 гадоў, да працы няздольны, зараз хворы. Муж да працы няздольны, калека, дзіцяці 14 гадоў, вучань, таксама зараз ляжыць хворы… Гаспадарка мая ў заняпадзе...

Прашу райвыканкам уважыць маю просьбу, інакш я не змагу болей існаваць» [6]. Г.А. Лазарчук было афіцыйна паведамлена, што ёй дазваляецца пакрыць запазычанасць бульбы шляхам здачы мяса ў суадносінах 1 кг мяса за 10 кг бульбы [7]. Аднак шматлікія просьбы падобнага кшталту задавальняліся толькі ў выключ-ных выпадках, да якіх, у прыватнасці адносіліся страта маёмасці ў выніку стыхійных бедстваў, поўная адсутнасць працаздольных членаў сям'і.

Пад уздзеяннем эканамічнага і пазаэканамічнага прымусу колькасць калгасаў паступова павялічвалася. Аднак яны у сваёй большасці былі маламоцнымі і нізкарэнтабельнымі, паколькі пераважна складаліся з сялянскіх гаспадарак, у якіх не мелася цяглавай сілы і буйной рагатай жывёлы. Таму вялікую ўдзельную вагу складала ручная праца. Акрамя таго, членамі калгасаў з'яўляліся многія сяляне, якія ніколі не былі добрымі гаспадарамі на зямлі.

Не стымулявала плённую працу калгаснікаў і такая форма ўліку іх працы, як працадзень, у якой растваралiся такiя галоўныя складаемыя працы, як яе колькасць і якасць. Эканамічнага абгрунтавання кошту розных відаў працы не існавала. Таму працадні часта налічваліся адвольна без вызначэння рэальнага ўкладу кожнага калгасніка ў агульную справу. Па гэтай прычыне кіраўніцтва калгасаў і нярэдка самі калгаснікі былі схільныя да ўраўнілаўкі ў налічэнні працадзён, што таксама падрывала стымулы калгаснікаў да плённай працы. На працадні калгаснікі амаль нічога не атрымлівалі і пражыць на іх не маглі. Напрыклад, у трох створаных у Кобрынскім раёне калгасах у 1940 г. было выдадзена авансам на працадні: у двух калгасах – па 2 кг збожжа, у адным – па 0,5 кг збожжа, гру-бых кармоў для жывёлы – ад 0,5 кг сена да 2-х кг саломы. Гэтым авансам і абмежавалі-ся [8]. Затое калгасы раёна ў 1940 г. поўнасцю выканалі план абавязковых збожжавых паставак дзяржаве. У роспачы калгаснікі жартавалі: «Што з гэтымі працаднямі рабіць: у печы ва-рыць ці сырымі есці?». У гэтых умовах галоўнай крыніцай самазабеспячэння калгасні-каў прадуктамі харчавання была асабістая падсобная гаспадарка, на якой яны карпелі пасля працы на калгасных палетках.

Разам з тым партыйная прапаганда актыўна і настойліва імкнулася распаліць працоўны энтузіязм калгаснікаў, уцягваючы іх у розныя формы сацыялістычнага спаборніцтва па нарошчванню аб'ёмаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У прыватнасці, быў разгорнуты стаханаўскі рух у гонар гадавіны ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Так, газета «Зара» у сваім нумары ад 21 жніўня 1940 г. з вялікім імпэтам паведамляла аб стаханаўскай працы калгаснікаў вёскі Казловічы Брэсцкага раёна ў гонар уз'яднання Беларусі. Паведамлялася, што калгаснікі працуюць з утроенай сілай, паказваюць узоры стаханаўскай працы, і што ўсенароднае 17 верасня яны вырашылі сустрэць поўным выкананнем усіх абавязацельстваў перад сацыялістычнай дзяржавай [2, с. 262]. Праўда, газета забыла паведаміць, што атрымалі на свае працадні калгаснікі-стаханаўцы і на які страўнік яны будуць святкаваць – поўны ці пусты?

Не палепшылі стан калгасаў і створаныя ў 1940 годзе машынна-трактарныя станцыі (МТС). Меркавалася, што яны стануць інструментам тэхнічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і сродкам дапамогі сялянству. Аднак гэтага не адбылося. Па-першае, МТС было вельмі мала. У 1940г. яны мелі ўсяго 951 трактар, 193 машыны, 843 трактарныя плугі, 438 культыватараў, 300 сеялак [9, с. 121]. Па-другое, іх паслугі калгасам і асабліва сялянам-аднаасобнікам былі вельмі дарагімі. Таму калгасы і сяляне нярэдка адмаўляліся ад іх паслуг. Аднак калгасам зрабіць гэта было амаль немагчыма, што яшчэ больш спусташала калгасную касу.

Аграрная палітыка таксама прадугледжвала ліквідацыю хутароў. Тым самым у спалучэнні з вышэй акрэсленымі антысялянскімі мерамі наносіўся моцны ўдар па заможнаму сялянству. Аднак масавае раскулачванне вёскі ў перадваенныя гады не праводзілася. У гэтым не было неабходнасці, бо заможная праслойка сялян-беларусаў была нязначнай па прычыне аграрнай палітыкі польскіх уладаў, якая была арыентавана на насаджэнне ў Заходняй Беларусі польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання.

Пераход да калектывізацыі выклікаў супраціўленне часткі сялян. Яно ў асноўным вялося на ўзроўні антыкалгаснай агітацыі. Сяляне пастаянна падкрэслівалі, што яны чакалі савецкую ўладу, якая павінна была вызваліць іх ад польскага прыгнёту, а атрымалі іншае: не вызваліла і «пачала піць апошнюю кроў з сялян». Яны ў роспачы гаварылі, што «прыйшлі бальшавікі, ды мусіць не тыя, якіх чакалі».

Сяляне-калгаснікі выказвалі сваю незадаволенасць калгасным кіраўніцтвам, якое ў многіх выпадках складалася з людзей, не карыстаўшыхся іх павагай. Яны падкрэслівалі, што нельга давяраць кіраўніцтва людзям, якія пры польскай уладзе «валяліся пад плотам», былі лайдакамі і злодзеямі. На калгасных сходах сяляне абураліся тым, што яны шмат працуюць, а за працадні нічога не атрымліваюць, бо калгасы павінны выконваць вялікія дзяржпастаўкі збожжа. На сходзе сяляне калгаса «17 верасня» Жабінкаўскага раёна заявілі, што «мы ўступілі ў калгас у ботах, а цяпер засталіся без ботаў». Рэзкай крытыцы было падвергнута праўленне калгаса, якое «складаецца з адных дурняў», не абараняе іх інтарэсаў і «танцуе пад дудку» раённага начальства. Члены калгаса гаварылі, што яны працуюць дзень і ноч і не бачаць хлеба, а аднаасобнікі працуюць менш і кожны дзень ядуць хлеб [10, с. 201–281].

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Заходняй Беларусі было створана 1 115 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 49 тыс., або каля 7% сялянскіх гаспадарак. Надзеі большасці сялянства на лепшае жыццё з усталяваннем савецкай улады ў перадваенны перыяд не спраўдзіліся. Неўзабаве яго напаткалі яшчэ больш суровыя выпрабаванні – пачалася вайна.

**Заключэнне**

Праведзенае даследаванне аграрных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі ў перадваенны перыяд дазваляе зрабіць наступныя высновы і абагульненні:

1. Мерапрыемствы па ліквідацыі польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання і надзяленні сялян зямлёй садзейнічалі задавальненню галоўнага эканамічнага інтарэсу сялянства і прыцягненню яго батрацка-бядняцкай часткі на бок савецкай улады.

2. Надзяленне сялян зямлёй стварыла больш спрыяльныя ўмовы для развіцця індывідуальнай сялянскай гаспадаркі. Аднак неўзабаве пачаў ажыццяўляцца курс, накіраваны на падрыў гэтай гаспадаркі шляхам яе абцяжэння вялікімі падаткамі і абавязковымі сельскагаспадарчымі пастаўкамі дзяржаве. Яшчэ большыя падатковыя абцяжэнні і розныя крыўды ў адносінах да заможных сялян прывялі да іх знішчэння як асобнага сацыяльнага слоя і ураўнавалі іх па маёмаснаму стану з сялянамі-беднякамі.

3. Масава-палітычная праца ў вёсцы пераважна не стасавалася з інтарэсамі і настроямі большасці сялянства, была накіравана на фарміраванні пэўных стэрэатыпаў мыслення і сацыяльных паводзін, неабходных уладзе. Сярод іх галоўны стэрэатып: сельгасарцель – адзіны шлях да заможнага і шчаслівага жыцця.

4. Ствараемы уладай эканамічны фон і сацыяльны настрой у вёсцы меў галоўную мэту – стварэнне , а калі больш дакладна – насаджэнне калгаснага ладу па тым узоры, які быў апрабіраваны ў канцы 1920-х – 30-я гг. у СССР і БССР.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М.П. Касцюк,І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі [і інш.] / Ін-т гісторыі АН Белпрусі. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560 с.

2. Хрестоматия по истории БССР (1917–1983) / Сост. А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – 2-е изд. перераб. и доп. – Минск : Изд-во «Университетское», 1984. – 453 с.

3. Бодак, А.Ю. Первичные мероприятия советской власти в аграрной сфере Западной Беларуси в 1939–1940 гг. / Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа : материалы регион. науч.-практ. конф., посвящённой 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР, 24–25 сент. 2009 г. / Ред. Ковалёва Н.Н., Малыхина Л.Ю. – Брест : БрГТУ, 2009. – С. 18–22.

4. Толочко, Д.М. Роль БССР в материально-техническом обеспечении объединения республики. / Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа : материалы регион. науч.-прак. конф., посвящённой 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР, 24–25 сент. 2009 г. / Ред. Ковалёва Н.Н., Малыхина Л.Ю. – Брест : БрГТУ, 2009. – С.198–204.

5. Белазаровіч, В. Асаблівасці калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі ў 1939–1941 гг. // Беларус. гістар. часопіс. – 1999. – № 1. – С. 36–45.

6. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 57. – Арк. 299. Заява грамадзянкі в. Хідры Хідрынскага сельсавета Кобрынскага раёна Лазарчук Г.А. па пытанні вызвалення яе ад дзяржпаставак бульбы ў сувязі з неўраджаем.

7. ДзАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 57. – Арк. 297. Афіцыйны адказ гр. в. Хідры Хідрынскага сельсавета Кобрынскага раёна Лазарчук Г.А. па пытанні вызвалення яе ад дзяржпаставак бульбы ў сувязі з неўраджаем.

8. ДзАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 72, Арк. 2. Дакладная запіска аб стане калгасаў і падрыхтоўкі да веснавой пасяўной кампаніі 1941 г.

9. Белазаровіч, В. Правядзенне калектывізацыі ў прадваенны час / В. Белазаровіч // Назаўсёды разам : Да 60-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск : БелЭН, 1999. – С. 116–124.

10. Ермаковіч, Л.І. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі на Брэстчыне (1939–1941 гг.) / Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : матэрыялы рэспуб. навук. канф. : у 4-х ч. – Гродна, 2003. – Ч. 4. – С. 279–282.

***Ermakovich L.I.* The Agriculture of Western Belarus in the Prewar Period (1939–1941)**

The author of the article tried to determine and analyze the main direction of the agricultural policy of the Soviet power in Western Belarus in the prewar period: the destruction of the agricultural legacy of the Polish state and of the wealthy part of peasantry, the actions aimed to satisfy the economic interests of the poorest part of peasantry and the beginning of the collective farms construction. In the context of the subject the essence of the political labor among the peasantry directed to the change of its world outlook and psychology and the creation of the positive image of the Soviet power are examined in the article. From the author’s point of view the agricultural policy of the Soviet power from its very beginning had no any alternative because it restricted the economic freedom and independence of the belarusian peasantry. This policy had its strategic goal aimed to create the conditions necessary for the development of agriculture based on the collective farms and this way was declared as a unique right way moving to socialism.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 03.09.2012